# АБ УСІМ, ШТО БАЛІЦЬ

№ 28/35/—9.УП.1976
МЕНСК

ТОЛЬКІ ГУТАРКА ХОДЗІЦЬ ТАКАЯ...
Я.КУПАЛА

## ГУТАРКА

### ПРА МОВУ І КАУБАСУ

Днямі стаю я ў чарзе за каўбасой і чую:

— Гэта ж столькі Беларусь дае мяса, а тут трэба выстойваць няма ведама колькі часу за нейкай нішчымнай каўбасой.

Сказанае мяне не здзівіла. Такое я ўжо неаднойчы чуў, стоячы ў даўжэзных чэргах. Здзівіла тое, хто гэта гаварыў. Голас мне здаўся знаёмым. І я не верачы сабе, падумаў: "Няўжо Яўхім Крывенька?" Гэта мой даўні знаёмы. Праўда, я яго ўжо даўно не бачыў, гадоў з пяць. Ён недзе пераехаў жыць у другі канец гораду.

Запомніўся ён мне найбольш тым, што заўсёды спаткаўшыся са мною, заўсёды ўшчуваў мяне за маю беларускасць:

— А вы ўсё гаворыце па-беларуску. Кіньце вы гэту сваю мову. Вунь другія ўжо даўно яе выракліся і жывуць лепш за вас. З ёю нікуды не выб'ешся , з ёю не прадасі і не купіш. Дык навошта яна патрэбна? Ну, хоць бы майму сыну? Ён і без яе вышэйшае абразаванне атрымае. Вось убачыце, што скора на ёй ніхто гаварыць не будзе, хіба толькі вы адзін. І правільна робіць Беларусь, што ад сваёй мовы адракаецца. Без яе можна абыйсціся. Затое ў нас каўбасы шмат, нідзе столькі няма, як у Беларусі. Вунь у Расіі пуста, як вымецена. Там ніякай каўбасы няма, а ў нас якой хочаш..."

Я з Яўхімам Крывенькам не спрачаўся, бо хіба такога ў чым пераканаеш? І вось раптам я чую такія словы. "А можа гэта не ён?" Не, ён. Я яго адразу пазнаў, угледзеўшыся ў чаргу, хоць ён і намнога пастарэў. Я падыйшоў да яго. Ён таксама мяне адразу пазнаў.

— Што за каўбасой стаім, — кажу я.

Яўхім Крывенька адчуваў ніякавата перада мною, відаць, успомніў усё тое, што гаварыў некалі мне.

— Ды вось жа прыходзіцца стаяць.

— А як сын? Паступіў куды-небудзь?

— Ого, паступіш тут у Беларусі, калі сюды з усяго Савецкага Саюзу з'язджаюцца. Ведама ж няма экзамена па беларускай мове. Няхай яны вось паспрабуюць паступіць у Літве.

Вось як! Нават і да Яўхіма Крывенькі дайшло, для чаго існуе родная мова, што аддаўшы яе, аддасі і ўсё астатняе, не атрымаўшы нічога ўзамен, апроч хіба нішчымнай каўбасы.